**В. М. Шавель, М. В. Швед**
Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт

Репозиторий БарГУ

# ФАРМІРАВАННЕ ЎМЕННЯЎ ПЕРАПРАЦОЎВАЦЬ НАВУКОВЫ ТЭКСТ

Адной з умоў эфектыўнага функцыянавання сістэмы адукацыі з’яўляецца падрыхтоўка спецыялістаў, якія здольны да даследчай дзейнасці.

Арганізацыя і правядзенне навуковага даследавання мае на мэце апрацоўку вялікага аб'ёму інфармацыі па заяўленай праблеме. Таму ўменні перапрацоўкі навуковай інфармацыі (вызначэнне галоўнага, выдзяленне сэнсавых частак, выяўленне прычынна-выніковых сувязей, інтэрпрэтацыя інфармацыі, абагульненне інфармацыі і інш.) павінны фарміравацца ў працэсе вывучэння дысцыплін усіх цыклаў тыпавога плана падрыхтоўкі спецыялістаў: сацыяльна-гуманітарнага, прыродазнаўчых дысцыплін, агульнапрафесійных і спецыяльных дысцыплін.

У ходзе даследчай дзейнасці ў студэнтаў фарміруюцца ўменні і навыкі пісьмовай пераапрацоўкі прачытанага навуковага тэксту (цытаванне, складанне канспекта, тэзісаў, рэферата, анатацыі і інш.), гэта значыць ідзе актыўны парцэс авалодання спосабамі самастойнага набыцця ведаў, новай і дадатковай інфармацыі, а таксама спосабамі сэнсавай пераапрацоўкі, запамінання інфармацыі і яе афармлення.

Пры падрыхтоўцы да семінарскіх і практычных заняткаў, на этапе збору літаратуры для напісання курсавой ці дыпломнай работы студэнты працуюць з рознымі навуковымі крыніцамі (манаграфіі, вучэбныя дапаможнікі, артыкулы і інш.), таму выкладчыку неабходна фарміраваць уменне вылучаць інфармацыю, якая раскрывае сутнасць праблемы, уменне выдзяляць асноўныя палажэнні і вядучыя ідэі. Агляд навуковай літаратуры і пры правядзенні лекцыйных заняткаў павінен насіць праблемны, а не храналагічны характар.

Уменне сцісла перадаваць інфармацыю складаецца з шэрагу больш прыватных: вылучаць галоўнае і другараднае, складаць план, сціскаць інфармацыю рознымі спосабамі, вызначаць найбольш аптымальныя моўныя сродкі.

Для афармлення вынікаў сваёй даследчай работы студэнтам неабходны такія ўменні, як уменне структураваць і граматна, паслядоўна выкладаць перапрацаваны матэрыял, здольнасць да самастойных абагульненняў і вывадаў, якія дастаткова поўна і дакладна адлюстроўваюць змест навуковых пытанняў.

На практычных занятках па беларускай мове паспяхова можна выкарыстоўваюць прыёмы абагульнення і аб'яднання пры аналізе вызначэнняў аднаго і таго моўнага паняцця, пададзенага рознымі аўтарамі. Папярэдне, зразумела, павінна быць акцэнтавана ўвага на класіфікацыйныя прыметы, паводле якіх вылучаюцца, напрыклад, часціны мовы (семантычныя, марфалагічныя, сінтаксічныя, словаўтварэнне, словазмяненне). Так, пры вывучэнні тэмы «Безасабова-прэдыкатыўныя словы (словы катэгорыі стану)» на этапе аналізу студэнтам былі прапанаваны наступныя вызначэнні:

Репозиторий БарГУ

– *Безасабова-прэдыкатыўныя словы* (*словы катэгорыі стану*) — група слоў, якія з’яўляюцца нязменнымі, але абазначаюць не прымету дзеяння ці якасці, а стан каго-небудзь ці чаго-небудзь і выступаюць выказнікамі пераважна ў безасабовых сказах [1, с. 216].

– *Безасабова-прэдыкатыўныя словы* — гэта самастойная часціна мовы, якая абазначае недынамічны стан прыроды, асяроддзя, чалавека, жывой істоты ці ацэнку стану або становішча з якога-небудзь боку і выступае ў функцыі галоўнага члена ў безасабовым сказе [2, с. 269].

– *Безасабова-прэдыкатыўныя словы* — гэта нязменныя знамянальныя словы, якія абазначаюць стан ці ацэнку і выконваюць ролю галоўнага члена ў безасабовых сказах [3, с. 330].

Пасля вылучэння агульнага і адметнага ў вызначэннях студэнты без цяжкасцей сфармулявалі свой варыянт, для іх больш запамінальны:

*Безасабова-прэдыкатыўныя словы* — гэта нязменныя знамянальныя словы, якія абазначаюць недынамічны стан прыроды, асяроддзя, чалавека, жывой істоты ці ацэнку стану або становішча з якога-небудзь боку і выконваюць функцыю выказніка ў безасабовым сказе.

У рабоце па стварэнні любога другаснага тэксту вылучаюць некалькі этапаў: чытанне, разуменне прачытанага, трансфармаванне атрыманай інфармацыі, г. зн. яе перафразаванне. Таму пры моўным афармленні другасных навуковых тэкстаў на практыцы часцей выкарыстоўваецца сціскванне навуковага тэксту (кампрэсія).

Узнаўленне прачытанага тэксту, як адзначаюць навукоўцы, можа адбывацца як за кошт двух асноўных шляхоў кампрэсіі — сціскання і пашырэння атрыманай інфармацыі (колькаснае змяненне прачытанага тэксту), так і скарачэнне аб’ёму тэксту, якое ажыццяўляецца з выкарыстаннем прыёмаў маўленчай кампрэсіі. Уменне скарачаць неабходна для стварэння другасных тэкстаў, што адпавядаюць патрабаванням жанраў навуковага тэксту: абагульненасць і абстрагаванасць, дакладнасць і аб’ектыўнасць, лагічнасць.

Прыёмы кампрэсіі студэнты часта выкарыстоўваюць пры напісанні рэфератаў розных тыпаў (інфарматыўных, індыкатыўных і інш.), анатацый артыкулаў, самастойна складзеных артыкулаў, а таксама пры падвядзенні вынікаў назіранняў, эксперыментаў у параграфах, раздзелах ці заключэннях вучэбна-даследчых работ.

Больш эфектыўна ідзе асэнсаванне і перапрацоўка навуковага тэксту, калі выкладчык прапануе спалучэнне розных прыёмаў кампрэсіі, напрыклад: спалучэнне выключэння і замены; замены, выключэння і аб’яднання і інш.

Аўтару часта неабходна захаваць адносна поўны аб’ём інфармацыі, у такім выпадку, кампрэсія навуковага тэксту адбываецца «пры дапамозе прыёмаў апушчэння, сумяшчэння і замяшчэння» [4, с. 53].

Рэпазіторый БарДУ

Студэнты без цяжкасцей выкарыстоўваюць на практыцы прыём апушчэння: выключаюць элементы, якія паўтараюцца, пабочныя і ўстаўныя канструкцыі, аднародныя члены, аднатыпныя канструкцыі, тлумачэнні, развагі. Да прыёмаў сумяшчэння, якія могуць выкарыстаць студэнты, адносяць: аб'яднанне парцэляваных канструкцый, некалькіх сказаў, звязаных адной думкай. Прыёмы замяшчэння звязаны з заменай складаных сінтаксічных канструкцый больш простымі з захаваннем сэнсу: аднародныя члены – абагульняльным словам, складаныя сказы – простымі сказамі, часткі тэксту – адным сказам.

Такім чынам, праводзячы навуковыя даследаванні, студэнты сустракаюцца з неабходнасцю перапрацоўкі, перафразавання вывучанай навуковай інфармацыі. Гэта магчыма пры сціслым і змястоўным яе выкладзе. Сцісканне інфармацыі, пададзенай ў навуковым тэксце, адбываецца рознымі прыёмамі кампрэсіі, знаёмства з якімі і выпрацоўка навыкаў паспяховага выкарыстання павінны фарміравацца пры вывучэнні ўсіх дысцыплін, уключаных у вучэбныя планы адпаведных спецыяльнасцей.

**Літаратура**

1 Сучасная беларуская літаратурная мова : марфалогія : вучэбны дапаможнік / Я. М. Адамовіч, Н. В. Гаўрош, М. Ф. Гуліцкі; рэд. Ф. М. Янкоўскі. — 2-е выд., дапрац. — Мінск : Вышэйшая школа, 1980. — 240 с.

2 Шуба, П. П. Сучасная беларуская мова: Марфаналогія. Марфалогія: вучэбны дапаможнік для філал. фак. ун-таў / П. П. Шуба. — Мінск : выд-ва «Універсітэцкае», 1987. — 333 с.

3 Сучасная беларуская мова : вучэб. дапаможнік / Л. М. Грыгор'ева [і інш.] ; пад агул. рэд. Л. М. Грыгор'евай. — Мінк : Выш. шк., 2006. — 559 с.

4 Маршэўская, В. В. Беларуская мова (прафесійная лексіка) у сінтаксічным і стылістычным аспектах: вучэбны дапам. / В. В. Маршэўская. — Гродна : ГрДУ, 2002. — 115 с.

Рэпазіторый БарДУ